# Актыўныя метады і прыёмы на ўроках гісторыі

Абагульненне вопыту дзейнасці

**М. У. Андала,**
настаўнік гісторыі
Мілявіцкага ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа Мастоўскага раёна

**Стратэгія сучаснай адукацыі заключаецца ў прадастаўленні магчымасці ўсім навучэнцам праявіць свае таленты і творчы патэнцыял. Гэта адпавядае сучасным гуманістычным тэндэнцыям развіцця айчыннай школы, для якой характэрна арыентацыя педагогаў на асобасныя магчымасці навучэнцаў. Гэтыя ідэі знайшлі адлюстраванне ў асноўных дзяржаўных дакументах аб адукацыі. У іх робіцца акцэнт на развіццё крэатыўных здольнасцей навучэнцаў, індывідуалізацыю і дыферэнцыяцыю іх адукацыі з улікам інтарэсаў і схільнасцей да творчай дзейнасці. Адным з асноўных прынцыпаў абнаўлення зместу адукацыі з'яўляецца яго асобасная арыентацыя, якая прадугледжвае апору на суб'ектны вопыт навучэнцаў, актуальныя патрэбы кожнага вучня. У сувязі з гэтым востра паўстала пытанне аб арганізацыі актыўнай пазнавальнай і стваральнай дзейнасці навучэнцаў, якая садзейнічае назапашванню творчага вопыту школьнікаў, як асновы, без якой самарэалізацыя асобы на наступных этапах адукацыі становіцца малаэфектыўнай.**

Таму эфектыўным спосабам вырашэння гэтых праблем у маёй педагагічнай практыцы стала выкарыстанне актыўных метадаў і прыемаў на ўроках гісторыі для развіцця крэатыўнага мыслення і павышэння матывацыі вучняў у адукацыйнай дзейнасці.

Педагагічны вопыт паказвае, што ў многіх дзяцей ёсць скрытыя здольнасці, і пры наяўнасці неабходных умоў развіцця і падтрымцы яны

могуць раскрыцца, праявіць сябе ў вызначанай вобласці. Пастаяннае развіццё крэатыўнасці магчыма толькі на такой псіхалагічнай базе, якая характарызуецца багаццем патрэбнасцей і інтарэсаў асобы, яе накіраванасці на поўную самарэалізацыю ў працы, зносінах, пазнанні; высокім узроўнем інтэлектуальных здольнасцей, адкрытасцю да ўсяго новага, гнуткім крытычным мысленнем, высокай працаздольнасцю чалавека, яго актыўнасцю.

Праблема крэатыўнага патэнцыялу вывучалася з розных бакоў. Так, ідэі творчай актыўнасці асобы знайшлі адлюстраванне ў працах А. С. Макаранкі, С. Ц. Шацкага, В. А. Сухамлінскага і іншых педагогаў. У шэрагу даследаванняў В. Д. Богаяўленскай, С. М. Бандарэнкі абгрунтаваны ўмовы зараджэння творчай актыўнасці ў працэсе навучання ў школе, распрацаваны метады развіцця творчага пачатку асобы, а таксама паказана, што існуюць шырокія магчымасці розных відаў дзейнасці ў развіцці творчай актыўнасці школьнікаў.

П. Торэнс вызначыў паказчыкі крэатыўнасці, этапы творчага працэсу, характарыстыку творчага працэсу, сфармуляваў асобасныя рысы творчых людзей. Крэатыўнасць – здольнасць да стварэння нестандартнага прадукту дзейнасці, новага, нетрадыцыйнага. П. Торэнс распрацаваў структуру крэатыўнасці [8].

А. Вярбіцкі інтэрпрэтуе сутнасць гэтага паняцця наступным чынам: актыўнае навучанне азначае сабой пераход ад пераважна рэгламентуючых, алгарытмізаваных, праграміраваных формаў і метадаў арганізацыі дыдактычнага працэсу да развіваючых, праблемных, даследчых, пошукавых, якія забяспечваюць нараджэнне пазнавальных матываў і інтарэсаў, умоў для творчасці ў навучанні [1, с. 37].

Мой вопыт пераканаўча паказвае, што паспяховае развіццё творчых здольнасцей вучняў немагчымае без сістэматычнага прымянення ў вучэбнай рабоце заданняў творчага характару. Выбар метадаў арганізацыі творчай дзейнасці ажыццяўляецца ў залежнасці ад мэт, узроўню складанасці зместу,

узроўню развіцця крэатыўных здольнасцей вучняў, дасведчанасці вучняў у пастаўленай праблеме, ступені праяўлення цікавасці, асабістага вопыту прымянення спосабаў вырашэння пастаўленай задачы.

На сваіх уроках я выдзяляю чатыры этапы. На першым этапе адбываецца актуалізацыя і сістэматызацыя існуючых ў навучэнцаў ведаў па дадзенаму пытанню або праблеме, выклікаю ўстойлівую цікавасць да вывучаемай тэмы, да вучэбнай дзейнасці. На гэтым этапе вучань ставіць перад сабой пытанне: што я ведаю па дадзенай праблеме? У яго фарміруецца ўяўленне, чаго ж ён не ведае і што хоча даведацца.

Знаёмячы навучэнцаў з фармуліроўкай тэмы, выкарыстоўваю ***прыем*** «***Кошык ідэй***». Ствараю праблемную сітуацыю тым, што навучэнцы павінны уявіць аб чым, якіх падзеях пойдзе размова і паставіць пэўныя задачы да ўрока. Ён дазваляе выявіць усё, што ведаюць і думаюць вучні па тэме занятка. Для гэтага размяшчаю на дошцы ўмоўны кошык, у які ў час эўрыстычнай гутаркі вучні пакладуць усе тыя ідэі, што датычацца тэмы ўрока. Так, напрыклад, у 8 класе пры вывучэнні тэмы па гісторыі Беларусі «Сельская гаспадарка і становішча сялян у першай палове XIX» на першым этапе вучні фіксуюць у сшытках усё, што ім вядома па тэме. У кошых трапляюць прыкладна наступныя: павіннасці сялян, памешчыцкія, дзяржаўныя сяляне, валочная памера, трохполле і г.д. Далей, у працэсе ўрока, кожнае выказванне аналізуецца і асэнсоўваецца.

Таксама выкарыстоўваю ***прыём*** «***Чыстай дошкі***». На дошцы запісаны пытанні, і па ходзе вывучэння новай тэмы вучні адказваюць на іх. У выпадку правільнага адказу пытанне сціраецца. У канцы ўрока дошка аказалася чыстай, што сведчыць аб дасягненні мэты.

***Прыём*** «***Верныя – няверныя сцвярджэнні***» – сцвярджэнні могуць быць самымі нечаканымі і нелагічнымі. Задача вучня: пагадзіцца ці не пагадзіцца з дадзенымі здагадкамі, паставіць плюс або мінус. Напрыклад:

- ✓ вяльмож хавалі ў магільніцах (так);
- ✓ абед вяльмож складаўся з аладкі, цыбуліны і вяленай рыбы (не);

- ✓ фараон мог загадаць пабіць вяльможу палкамі (так).

***Прыём «Сэнсавы рад».*** Навучэнцам (магчымая праца ў групах) неабходна прапанаваць агульнае паняцце да вызначанага шэрагу тэрмінаў.

- ✓ Вайна, бойка, сварка, рэвалюцыя, спрэчка (канфлікт).
- ✓ Закон, норма, парадак дзеянняў, этыкет (правіла).
- ✓ Прымус, жорсткасць, пагроза, ціск (гвалт).
- ✓ Дагавор, узаемадзеянне, сумеснае рашэнне (пагадненне).
- ✓ Тэлебачанне, радыё, газеты, інтэрнэт (СМІ).

***Прыём «Чацвёрты лішні»*** навучэнцам прапануецца чатыры словы, неабходна выключыць адно з іх, самастойна вызначыўшы падставу, па якой аб'яднаны астатнія тры словы.

Такія прыёмы таксама дапамагаюць мне ўключыць кожнага навучэнца ў абмеркаванне таго, што ён ведае па дадзенай тэме, праблеме. Гэта прымушае навучэнца аналізаваць уласныя веды, вызначаць іх узровень.

Другі этап – **асэнсаванне**. Задача гэтага этапу – дапамагчы актыўна ўспрымаць новую інфармацыю і суаднесці старыя веды з новымі, асэнсаваць яе і выкарыстоўваць набытыя веды. Вучні пад маім кіраўніцтвам адказваюць на пытанні, якія самі перад сабой паставілі на першай стадыі. Адной з умоў развіцця крэатыўнага мыслення з'яўляецца адсочванне свайго разумення пры працы з вывучаемым матэрыялам. На другім этапе адбываецца праца з тэкстам, навуковым ці мастацкім. Гэта праца будзе паспяховай, калі навучыць дзяцей правільна апрацоўваць тэксты: выбіраць галоўную інфармацыю, фіксаваць яе, правільна афармляць і карыстацца ёю. Вырашыць дадзеную задачу мне дапамагаюць прыёмы: кластары, праблемныя пытанні, сітуацыі, пазнавальныя задачы, гульні і іншыя.

**Кластар** («гронка») – вылучэнне сэнсавых адзінак тэксту і графічнае іх афармленне ў выглядзе гронкі. Гэты прыём ужываецца пры сістэматызацыі інфармацыі, атрыманай з асноўнай крыніцы (тэкстаў) у выглядзе пытанняў або загалоўкаў сэнсавых блокаў (Дадатак 1).

Пры стварэнні праблемнай сітуацыі на ўроку я выкарыстоўваю:

1) факты, ідэі, якія выклікаюць здзіўленне, здаюцца парадаксальнымі, якія дзівяць сваёй нечаканасцю;

2) ствараю сітуацыю канфлікту, калі новыя факты і высновы ўступаюць у супярэчнасць з устоянымі ў навуцы тэорыямі і ўяўленнямі;

3) калі праблемнае заданне змяшчае недастатковую колькасць дадзеных для яго рашэння;

4) стварыць сітуацыю здагадкі, якая заснавана на магчымасці вылучыць уласную версію аб прычынах, характары, наступствах гістарычных падзей;

5) формамі вырашэння праблемных сітуацый могуць быць: праблемныя задачы і заданні, праблемная лекцыя, задачы даследчага характару, дыскусіі, работа з гістарычнымі дакументамі, карта-схемамі, ілюстрацыямі.

Вось <u>прыклады праблемных задач.</u>

1. В. Г. Бялінскі пісаў аб бітве пад Палтавай, што «...гэта была бітва за існаванне цэлага народа, за будучыню цэлай дзяржавы». Ці меў рацыю В. Г. Бялінскі? Даказаць сваё меркаванне.

2. У Паўднёвым Міжрэччы багатыя людзі паказвалі ў сваім завяшчанні сярод іншай маёмасці прадметы з дрэва – ложак, табурэт і дзверы. Чаму дзеці і ўнукі атрымлівалі ў спадчыну разам з домам, хатнім начыннем, зліткамі срэбра такі, на наш погляд, дзіўны для згадвання ў завяшчанні прадмет, як дзверы? Абгрунтуйце свой адказ.

***Прыём «Лаві памылку»*** – гэта ўніверсальны прыём, які актывізуе ўвагу навучэнцаў, фарміруе ўменне аналізаваць інфармацыю, ўменне прымяняць веды ў нестандартнай сітуацыі, ўменне крытычна ацэньваць атрыманую інфармацыю. Навучэнцам прапаную інфармацыю, якая змяшчае невядомую колькасць памылак. Навучэнцы шукаюць памылку групай ці індывідуальна, спрачаюцца, раяцца. Прыйшоўшы да пэўнага меркавання, выбіраюць спікера. Спікер передае вынікі настаўніку або абвяшчае заданне і вынік яго рашэння перад усім класам. Каб абмеркаванне не зацягнулася,

загадзя вызначаю на яго час. Напрыклад: вучні атрымліваюць серыю цытат са спасылкай на аўтараў  або тэкст з памылкамі па тэме. Вызначаюць, у якім выпадку цытата не магла належаць гэтаму аўтару. Даказваюць сваё меркаванне.

Навучэнцы вучацца ставіць пытанні да вывучаемага матэрыялу – пры выкарыстанні **_прыёму «Дрэва мудрасці»_**. На ўроку вучням даецца заданне: па ходзе тлумачэння або працы з тэкстам запісаць на трох лісточках тры розныя па ўзроўні складанасці пытанні. Пасля вывучэння матэрыялу пытанні здаюцца. Найбольш цікавыя ацэньваюцца, афармляюцца ў выглядзе яблыкаў ці лісцяў і прымацоўваюцца да «Дрэва мудрасці» (чырвоныя – на 10-9, жоўтыя – на 8-7, зялёныя – на 6-5). На наступных уроках вучні «зрываюць» плод ці ліст і адказваюць.

Наступны актыўны метад, які выкарыстоўваю на ўроках гісторыі – гэта **_гульня_**. Варыянтаў гульнявых сітуацый можна прывесці мноства: крыжаванкі, «Тры сказы», «Інтэрв'ю з гістарычным героем», «Знайдзі памылку», «Аўкцыён імёнаў», «Адгадай тэрмін, героя і падзею».

**_Гульня «Тры сказы»:_** зачытваецца кароткае апавяданне або дакумент. Вучням неабходна ўважліва выслухаць і перадаць змест апавядання або дакумента трыма простымі сказамі. Перамагае той, у каго апавяданне карацейшае і пры гэтым дакладна перадае змест. Іншы варыянт гульні – праца з друкаваным тэкстам. Гэта можа быць урывак з падручніка або загадзя падрыхтаваны настаўнікам тэкст. Тры простыя сказы вучні могуць запісаць у сшытку. У гэтым выпадку зручней выявіць пераможцу, таму што бачна індывідуальная праца вучня. Гэтая гульня дапамагае развіваць вельмі важнае ўменне вылучаць галоўнае, на якім грунтуюцца навыкі і ўменне арыентавацца ў інфармацыйным патоку, а таксама ўменне скласці план, канспект, рэферат.

Трэці этап – **замацаванне ведаў**. Тут асноўным з'яўляецца цэласнае асэнсаванне, абагульненне атрыманай інфармацыі, замацаванне новых ведаў,

новай інфармацыі навучэнцам. На гэтым этапе фарміруецца таксама ўменне самастойна вызначаць напрамкі ў далейшым вывучэнні матэрыялу.

Заданні даю розныя. Прапаную за пэўны часавы прамежак напісаць спіс са слоў, цесна звязаных з вывучаемай тэмай. Важны элемент спаборніцтва: перамагае той (ці тыя), чый спіс акажацца самым правільным і доўгім – ***прыём «Гістарычная азбука».***

***Прыём*** «***Аўкцыён імён***» мае два варыянты: I варыянт – адразу назваць імёны, якія можна аднесці да вывучанай тэмы; II варыянт – на працу ў сшытку даецца 5 хвілін. Прызначаецца кошт за пэўную колькасць імёнаў. Перамагае той, чые веды будуць найбольш поўнымі.

***Прыём*** «***Гістарычны футбол***» – клас дзеліцца на каманды (звычайна па радах), кожная з якіх атрымлівае заданне скласці пытанні па пэўным матэрыяле: два простых (са слоў хто, што, калі) і адзін складаны (са слоў чаму, навошта, у чым адрозненне; растлумачце і г.д.). Звычайна праца выконваецца індывідуальна ў сшытках, а групавая прыналежнасць неабходна толькі пры вызначэнні чаргі пытання: 1 рад задае пытанне 2, 2-3-му, 3-1-му. Калі ніхто з каманды не змог адказаць на пытанне, то ўвесь рад пазбаўляецца права задаваць пытанне на працягу 1 тура, а значыць – рызыкуе рэйтынгам.

Выкарыстанні ***прыёму «Імя, дата, падзея»*** спрыяе развіццю лагічнага мыслення, ўвагі, дапамагае аперавацъ фактычным матэрыялам, замацоўваць храналагічныя веды па гісторыі.

Падвесці вынік урока, зафіксаваць свае веды вучням дапамагае ***прыём*** «***Гістарычны кейс***»***.*** Ён перамяшчаецца ад аднаго вучня да другога. Кожны не проста фіксуе поспех, але і прыводзіць пэўны прыклад. Калі трэба сабрацца з думкамі, можна сказаць «прапускаю ход». Прыклад: я навучыўся складаць план тэксту; я ведаю калі адбылося хрышчэнне Русі; я, нарэшце, запомніў дату Кулікоўскай бітвы.

***Прыём «Тэлеграма»*** – прыём актуалізацыі суб’ектыўнага вопыту. Вельмі кароткі запіс. Напрыклад: коратка напісаць самае важнае, што запомніў з урока з пажаданнямі суседу па парце і адправіць (абмяняцца).

Метадаў і прыёмаў развіцця крэатыўнага мыслення шмат. Гэта разнастайнасць дапамагае рабіць урокі цікавымі і насычанымі, рознымі, непадобнымі адзін да другога, а працу навучэнцаў эфектыўнай і рознабаковай, якая прыносіць задавальненне. Я склала табліцу выкарыстання прыёмаў на кожнай з стадый урока (Дадатак 2). Камбінуючы прыёмы, планую ўрокі ў адпаведнасці з узроўнем падрыхтаванасці навучэнцаў, іх узроставымі катэгорыямі, мэтамі ўрока і аб'ёмам вучэбнага матэрыялу. Такім чынам атрымалася сістэма выкарыстання актыўных метадаў і прыёмаў на ўроках гісторыі (дадатак 3).

Так, дзякуючы выкарыстанню вышэй апісаных прыёмаў, у маіх вучняў павысілася матывацыя да навучання, больш шырока пачалі выкарыстоўвацца навыкі даследавання, сфарміравалася творчае мысленне. Яны навучыліся задаваць больш адкрытых пытанняў, удумліва чытаць і выдзяляць асноўнае ў прачытаным, прымяняць правілы і тэорыю ў практычных сітуацыях, бачыць памылкі ў логіцы разважання, праводзіць адрозненні паміж фактамі і вынікамі. Немалаважнае значэнне тут мае і праца вучняў з тэкстамі. Актыўнае прымяненне ў практыцы тэкстацэнтрычнага падыходу разам з прымяненнем актыўных метадаў з’яўляецца сродкам фарміравання камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Вяземский, Е. Е.** Как сегодня преподавать историю в школе: пособие для учителя / Е. Е. Вяземский. – М.: Просвещение, 1999. – 112 с.
2. **Зимняя, В. Н.** Педагогическая психология / В. Н. Зимняя. – М.: Логос, 2004. – 175 с.
3. **Лернер, И. Я.** Дидактические основы методов обучения / И. Я. Ларнер. – М.: Педагогика, 2006. – 186 с.
4. **Якушева, Г. И.** Использование творческих заданий на уроках дисциплины «История» [Электронный ресурс ]. – Режим доступа: https://e-koncept.ru/2015/95622.htm. – Дата доступа: 21.12.2023.

5. **Селевко, Г. К.** Современные образовательные технологии: учебное пособие / Г. К. Селевко. – М.: Народное образование, 1998. – 208 с.

6. **Григальчик, У. К.** Обучаем иначе: Стратегия активного обучения в школе / У. К. Григальчик, Д. И. Губаревич [и др.]. – Минск: БИП-С, 2003. – 182 с.

**Дадатак 1**

## Прыём «Кластар»

Складанне кластара па тэме «Алімпійскія гульні»



**Дадатак 2**

**Класіфікацыя актыўных метадаў і прыёмаў**

| Метады арыентавана-матывацыйнага этапа | Метады аперацыйна-пазнавальнага этапа | Метады этапа сістэматызацыі, замацавання і карэкцыі | Метады этапа рэфлексіі |
|---|---|---|---|
| «Сэнсавы рад», «Кошык ідэй», «Чыстая дошка», «Верныя-няверныя сцвярджэнні» | Кластар, праблемная сітуацыя, праблемныя задачы, «Лаві памылку», «Дрэва мудрасці», крыжаванкі, «Тры сказы», «Інтэрв’ю з гістарычным героем», «Аўкцыён імёнаў», «Адгадай тэрмін, героя і падзею» | «Аўкцыён імён», «Гістарычная азбука», «Імя, дата, падзея», «Гістарычны футбол» | «Тэлеграма» «Гістарычны кейс» |

**Дадатак 3**

**Сістэма выкарыстання актыўных метадаў і прыёмаў на ўроках гісторыі**

| Клас, тэма | Актыўныя метады | Фарміруемыя ўменні, веды і навыкі |
|---|---|---|
| 5 клас<br>Старажытная Фінікія | 1. «Чыстая дошка»<br><br>2. «Лаві памылку», «Тры сказы», праблемныя задання (работа з картай, тэкстам, ілюстрацыямі), «Інтэрв’ю з жыхаром горада», кластэр «Вынаходствы фінікійцаў»<br><br>3. «Дрэва мудрасці» | Вызначэнне ўзроўню ведаў і думак па тэме. Уменне вызначаць асаблівасці, выдзяляць галоўнае ў тэксце; паказываць на гістарычнай карце месцазнаходжання дзяржаў, месцы вывучаемых падзей; слакдаць расказ з апорай на тэкст, ілюстацыю; |

| | | |
|---|---|---|
| | 4. «Гістарычны кейс» | параўноўваць падзеі, прыродныя ўмовы, рэлігійныя ўяўленні, вынаходствы;<br>складаць пытанні.<br>Ведаць паняцці, даты, асноўныя падзеі і дасягненні. |
| 7 класс<br>Сельская гаспадарка Рэчы Паспалітай ў XVI ст. | 1. «Сэнсавы рад»<br><br>2. Праблемныя пытанні; работа з кластэрам «Землеўладалбнікі ў Рэчы Паспалітай» і дыяграмай «Кошт прадукцыі сельскай гаспадаркі»;<br>складанне табліцы «Аграрная рэформа 1557 года»;<br>складанне кластара «Феадальныя павіннасці»;<br>Рашэнне прабдемных задач (формы супраціўлення, выказванне Л.Сапегі аб сялянах)<br><br>3. Крыжаванка; «Гістарычная азбука»<br><br>4. «Тэлеграма» | Вызначэнне ўзроўню ведаў па тэме.<br>Уменне характызаваць прычыны, умовы і вынікі рэформы, становішча сялян;<br>раскрываць асноўныя формы сацыяльнага пратэсту ў вёсцы;<br>выдзяляць галоўнае ў тэксце; рабіць высновы.<br>Ведаць азначэнні гістарычных паняццяў |
| 8 клас<br>Паўстанне 1863 – 1864 гадоў | 1. «Кошык ідэй»<br><br>2.Кластар «Палітычныя плыні», праблемныя пытанні, «Інтэрв'ю з гістарычным героям», пазнавальныя задачы, «Дрэва мудрасці»<br><br>3. «Гістарычны футбол» | Вызначэнне ўзроўню ведаў па тэме.<br>Уменне сістэматызаваць матэрыял;<br>вызначаць прычыны і характар паўстання;<br>характызаваць асобу К Каліноўскага і яго погляды;<br>ставіць пытанні да матэрыялу; |

| | | |
|---|---|---|
| | 4. «Гістарычны кейс» | Ведаць сутнасць ідэалогіі заходнерусізму, погляды рэвалюцыянераў-дэмакратаў, азначэнні гістарычных паняццяў. |
| 9 клас<br>БССР у гады новай эканамічнай палітыкі | 1. «Кошык ідэй»<br><br>2.Праблемная сітуацыя, кластар «Новая эканамічная палітыка», праблемныя пытанні, «Лаві памылку», «Інтэрв'ю з селянінам або гарадскім жыхаром»<br><br>3. «Гістарычны футбол»<br><br>4. «Тэлеграма» | Вызначэнне ўзроўню ведаў па тэме.<br>Уменне характызаваць і параўноваць навую эканамічную палітыку з выкарыстаннем тэкста, ілюстацый, гістарычных дакументаў;<br>вызначаць эфектыўнасць новай эканамічнай палітыкі для развіцця сельскай гаспадаркі;<br>параўноўваць палітыку «ваеннага камунізму» і новую эканамічную палітыку;<br>тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі;<br>рабіць высновы.<br>Ведаць асноўныя даты, паняцці; перадумовы увядзення новай эканамічнай палітыкі, мэты і мерапрыемствы, вынікі |